Алесь Гізун



...такі дзень нараджае паэтаў,
і ў такі ж паміраюць яны...

# У чаканьні Калядаў...

## ДА СЬВЕЦІЦЦА...

Вымак брук, як мая душа –
не паможа смугі сурвэціна,
гэта Бог на яго з каўша
срэбра ліў і шаптаў: «да сьвеціцца…»

Ўвесь у дрыжыках, як дзіця,
хмуры дзень дабрыдзе да восені…
Вымак брук, як мая душа,
але сонца ўжо зьзяе ў просіні.

## СУХАЯ ТРАВА

Ах, якая сухая трава, якая трава сухая...
І хаця гэты дзень загубіўся

сярод пылу астатніх дзён,
птушкі трызьнілі навальніцамі,
і пра штосьці шаптаў мне клён.
Заблудзілася ў снах канвалія,
пераходзячы ноч у брод,
ах, якая трава сухая, —
на расстаньне, на слоў адлёт.
Такі дзень нараджае паэтаў,
і ў такі ж паміраюць яны
у краіне далёкай, сьветлай
у зяніце чужой вясны.
Глянь, як сонца між хмар канае,
і крывёй зіхаціць раса...
Ах, якая трава сухая, якая сухая трава...

* * *

Адчуваю прыцягненьне
безназоўнае травы...
Анёлы ў белым спецадзеньні
на дровы ходаюць платы,
і сушаць крылы,
і жартуюць,
і п’юць запараныя травы,
аб чымсьці сьцішана смуткуюць,
даўно няголеныя твары...

Мы робім стаўкі на дзяцей
і пераварваем суглінак,
а па дарозе да надзей
ляжыць зламаная каліна…

## У ЧАКАНЬНІ КАЛЯДАЎ

Ляціць жыцьцёвы шлях,
як птах,
скрозь восень
наўздагад
у вырай…
Зьвініць лязо,
нямее страх
на шыях дзён,
а у прадоньнях чорнакрылых
зіма бялее, як праклён.